# ВОДЗЫЎ

на аўтарэферат дысертацыі на саісканне вучонай ступені доктара гістарычных навук Кітурка І. Ф. “Станаўленне і развіццё дзяржаўнай мытнай службы Вялікага Княства Літоўскага (1764–1795 гг.)”

Дысертацыя Кітурка Ірыны Фёдараўны прысвечана цікаваму, але практычна недаследаванаму пытанню: станаўленню і развіццю мытнай службы ВКЛ у другой палове XVIII ст. У айчыннай і замежнай гістарыяграфіі дагэтуль дадзенае пытанне спецыяльна не распрацоўвалася. Разам з тым, менавіта ў згаданы перыяд закладваліся асновы мытнай службы як спецыяльнага інстытута ў сістэме дзяржаўнага кіравання, які працягвае адыгрываць значную ролю і ў нашы часы. Пастаяннае ўдасканаленне дзяржаўнага механізму Рэспублікі Беларусь, у тым ліку яе мытнай службы і мытнай палітыкі, надае дадатковую актуальнасць дысертацыйнаму даследаванню, якое пашырае гістарычны досвед аб адпаведных інстытутах дзяржаўнай улады і кіравання ў папярэднія эпохі.

Тэма дысертацыі адпавядае актуальным напрамкам навуковых даследаванняў у Рэспубліцы Беларусь. Праца выконвалася ў рамках дзяржаўных праграм навуковых даследаванняў “Дзейнасць Скарбавай камісіі ВКЛ у справе эканамічнай мадэрнізацыі дзяржавы ў другой палове XVIII ст.” (2014–2015 гг.), “Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства” заданне 1.1.01 “Мытная служба Вялікага Княства Літоўскага ў сістэме рэфармавання дзяржаўнага апарата і развіцця гандлю ў другой палове XVIII ст. (1764–1795 гг.)” (2016–2020 гг.).

Структура дысертацыйнага даследавання поўнасцю адпавядае патрабаванням ВАК Рэспублікі Беларусь. Яно складаецца з раздзелаў “Тэрміны і азначэнні”, “Пералік скарачэнняў і абазначэнняў”, уводзін, агульнай характарыстыкі працы, шасці глаў, падзеленых на 25 раздзелаў, заключэння, спіса выкарыстаных крыніц і дадаткаў, што ўтрымліваюць табліцы, карты і ілюстрацыі. Афармленне і змест аўтарэферата таксама адпавядае дзеючым патрабаванням.

У першай главе аналізуюцца гістарыяграфія і крыніцы па тэме даследавання. У гістарыяграфічным аналізе знайшлі адлюстраванне працы, створаныя як айчыннымі, так і польскімі, украінскімі, літоўскімі і расійскімі навукоўцамі. Паказана спецыфіка крыніцазнаўчай базы дысертацыі. Прапанаваныя саіскальнікам прынцыпы, агульнанавуковыя і спецыяльныя метады гістарычнага пазнання дазваляюць дасягнуць мэты і вырашыць задачы, вызначаныя ў даследаванні.

У другой главе ахарактэрызаваны арганізацыйныя мерапрыемствы, якія праводзіліся ў ВКЛ па стварэнні мытнай службы ў якасці асобнага інстытута ў сістэме кіравання гэтай дзяржавы. Аўтарам вызначаны прычыны і канкрэтны алгарытм стварэння мытнай службы, месца гэтых мерапрыемстваў у шэрагу рэформ дзяржаўнага апарату ў Кароне і ВКЛ азначанага часу. Таксама паказана роля Скарбавай камісіі ў рэгуляванні і развіцці мытнай справы, арганізацыйная структура дзяржаўнай мытнай службы ў ВКЛ, якая стварался і ўдасканальвалася з улікам існаваўшых традыцый пры выкарыстанні новых падыходаў.

У трэцяй главе саіскальнікам праведзены аналіз асноўных падыходаў ў правядзенні кадравай палітыкі ВКЛ у сферы камплектавання штата мытнай службы, вызначэння памеру і ўмоў матэрыяльнага ўтрымання яе службоўцаў. Выяўлены канкрэтныя пасады мытных служачых і іх колькасць, іерархія кіравання, паказаны патрабаванні да прэтэндэнтаў і мытнікаў, сацыяльны статус, канфесійная прыналежнасць, ступень адукацыі, кар'ерныя характэрыстыкі службоўцаў. На падставе зместу нарматыўных дакументаў вызначаны абавязкі і нормы службовага этыкету мытнікаў, памеры іх грашовага забеспячэння.

У чацвёртай главе вылучаны асноўныя прычыны змен у размяшчэнні мытняў на тэрыторыі ВКЛ, якія адбываліся ў асобныя перыяды. Адзначаны асаблівасці кожнага з чатырох вызначаных аўтарам дысертацыі перыядаў.

Пятая глава дысертацыі прысвечана комплекснаму разгляду ролі мытнай службы ў забеспячэнні эканамічнага развіцця ВКЛ у другой палове XVIII ст. У асобных радзелах главы разгледжаны мытныя пошліны і тарыфы, складзеныя для іх правільнага вызначэння і спагнання, паказаны сістэмы мытнага кантролю і мытнага справаводства. На прыкладзе Шчэбрскай мытні Літоўскай рэпартыцыі зроблены разгляд інфрастркутуры мытнай каморы. Прааналізаваны паступленні ў дзяржаўны скарб ад мытных збораў і іх размеркаванне па асобных напрамках выдаткаў.

Разгляд сістэмы дзяржаўнага кантролю за дзейнасцю мытнай службы ВКЛ у другой палове XVIII ст. на падставах матэрыялаў люстрацый мытняў 1769, 1774, канца 1770-х – пачатку 1780-х гг., інспекцыі камор 1786 г. камісарам Скарбавай камісіі М. К.Агінскім, а таксама судовай справы І. Кліковіча знайшоў адлюстраванне ў шостай главе дысертацыі, дзе саіскальнікам паказаны сістэмныя недахопы ў арганізацыі дзейнасці мытных камор і Скарбавай камісіі ВКЛ.

Выкарыстанне прапанаванай дысертантам метадалогіі даследавання, увядзенне ў навуковае абарачэнне шырокага кола крыніц дазволіла ёй упершыню ў гістарыяграфіі правесці комплексны навуковы аналіз новай для гістарыяграфіі тэмы, якая раней не была раскрыта ў гістарычнай навуцы.

Апрабацыя дысертацыйнага даследавання адбылася на 26 міжнародных і рэспубліканскіх навуковых канферэнцыях, кангрэсах, навуковых сходах. Яго высновы прадстаўлены ў 36 публікацыях саіскальніка, у тым ліку манаграфіі і 19 артыкулаў у выданнях, што ўключаны ў Пералік навуковых выданняў для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў. Вельмі важным падаецца тое, што матэрыялы дысертацыі ўжо выкарыстоўваюцца ў адукацыйным працэсе Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, устаноў адукацыі “Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купала”, “Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ефрасінні Полацкай”, “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту”.

Прадстаўленыя ў дысертацыі палажэнні, якія выносяцца на абарону, і высновы, якія ўтрымліваюцца ў ёй, сфармуляваны карэктна, маюць завершаны характар і падмацаваны неабходнымі спасылкамі. Атрыманыя ў ходзе даследавання высновы поўнасцю аргументаваны і маюць высокую ступень дакладнасці, дзякуючы грунтоўнаму аналізу апублікаваных

дакументаў, а таксама крыніц з архіваў, большасць з якіх раней не публікавалася.

Перакананы, што дысертацыйнае даследаванне Кітурка І. Ф. мае высокую навуковую вартасць. Не выклікае ніякага сумнення, што дысертацыя з'яўляецца самастойна выкананай кваліфікацыйнай навуковай працай, мае ўнутранае адзінства, сведчыць аб значным асабістым укладзе аўтара ў гістарычную навуку, прысвечана распрацоўцы новага навуковага накірунку і ўтрымлівае прынцыпова новыя навуковыя вынікі, спалучэнне якіх з'яўляцца буйным дасягненнем ў айчыннай гісторыі. Кітурка Ірына Фёдараўна, безумоўна, заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені доктара гістарычных навук.

Першы прарэктар Дзяржаўнай установы адукацыі "Мінскі гарадскі інстытут развіцця адукацыі" доктар гістарычных навук, прафесар С.П.Стрэнкоўскі

08.11.2023

УДОСТОВЕРЯЮ
Начальник отдела кадров
_______ О.В.Чернявская
"08" 11 2023 г.